# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 мая 2017 г.
№16 (400)




стар. 3

**Чаго не хапае вясковай культуры?**



стар. 5

**Каго падвезці да паліклінікі?**



стар. 6

**Прадпрымальніцтва з сацыяльнай адказнасцю**

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

# ДАРОГУ ПРЫВАТНІКУ

## Дзяржава хоча стварыць канкурэнцыю ў сферы сацыяльных паслуг



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Алеся ХВАШЧЭЎСКАЯ — дырэктар тэрытарыяльнага Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ушацкага раёна — наведвае пенсіянерку Ганну ШЧЭРБІК, якой сёлета споўніцца дзевяноста тры гады. Доўгажыхарка жыве ва Ушачах.

**Амаль кожны пяты беларус дасягнуў узросту 60 гадоў і больш, практычна кожны дваццаты мае інваліднасць. У выніку павялічваецца патрэба людзей у сацыяльных паслугах. Эксперты задаюцца пытаннем: як задаволіць попыт на сацыяльнае абслугоўванне, які ўзрастае, і адначасова павысіць эфектыўнасць фінансавых рэсурсаў, што выдзяляюцца грамадствам для забеспячэння належнага ўзроўню і якасці жыцця людзей?**

— Для гэтага неабходна, каб у аказанні сацыяльнай дапамогі не было манаполіі дзяржавы, — лічыць **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА.** — Аказваць сацыяльныя паслугі, якія карыстаюцца попытам у спажыўцоў, могуць і павінны таксама і недзяржаўныя структуры: некамерцыйныя арганізацыі, прыватныя прадпрыемствы, індывідуальныя прадпрымальнікі — у рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

стар. 4–6

ЗДАРОЎЕ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

# НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ГОРАДА

**Наваполацкая цэнтральная гарадская бальніца ўжо сёлета будзе мець усё, што неабходна для аказання медыцынскай дапамогі на сучасным узроўні. Застаецца атрымаць камп'ютарны тамограф і ангіёграф. Памяшканні для ўстаноўкі новай тэхнікі гатовыя, спецыялісты падрыхтаваныя. Пацыенты — у чаканні, бо, вядома, у справе атрымання лячэбнай дапамогі адлегласць мае значэнне. Адна справа ехаць па высокія тэхналогіі ў Віцебск ці нават Мінск, і другая — мець усё, што называецца, пад рукой.**

Паслугамі бальніцы з 2013 года карыстаюцца не толькі жыхары самога Наваполацка, але і дзевяці навакольных раёнаў — многія з іх заўважаюць, што цяпер няма неабходнасці рвацца на абследаванне і лячэнне ў Віцебск ці сталіцу.

Мы з фотакарэспандэнтам вырашылі паглядзець у першую чаргу тое, у чым наваполацкая ўстанова аховы здароўя не саступае гарадскім бальніцам Мінска. Пачалі з асобнага корпуса радзільнага дома, які ў 2013-м быў перааснашчаны. Тут чыста, прыгожа, па-сучаснаму, і без бахілаў ды халата не пройдзеш.

— Раней існавалі два аддзяленні на 60 ложкаў у Наваполацку і Полацку, а затым быў створаны адзіны перынатальны цэнтр, — тлумачыць **загадчыца радзільнага дома Маргарыта РАЗІНА.** — У Полацку засталася кансультацыйная дапамога, а ўсіх парадзіх з двух гарадоў — каля 2,6—2,8 тысячы ў год — прымаем тут. Акрамя таго, усе складаныя выпадкі з дзевяці тэрытарыяльна блізкіх раёнаў таксама накіроўваюцца да нас. Практыка паказвае, што якасць аказання дапамогі стала ў выніку лепшай. За 30—40 хвілін, максімум за адну гадзіну, можа даехаць любая парадзіха. І гэта норма для родаў. Даязджаюць нават тыя, каму патрабуецца экстранная дапамога. Урачы на прыёме ўсё тлумачаць жанчынам — калі трэба ехаць, чаму не варта ні ў якім разе нараджаць дома, каб не рызыкаваць жыццём і здароўем ні сваім, ні дзіцяці.

У акушэрскім корпусе бальніцы — пяць паверхаў, тут размяшчаюцца ўласна акушэрскія і гінекалагічнае аддзяленні, рэанімацыя на шэсць ложкаў. Раней спецыяльнай рэанімацыі для парадзіх не было, а цяпер урачы-рэаніматолагі праводзяць абязбольванне ў родах — па паказаннях і па жаданні, анестэзію падчас апаратыўных умяшанняў.

стар. 8



Фота Надзеі БУЖАН.

Новы палачанін нарадзіўся!